**26-ГА ЛІСТАПАДА — 57-Я ГАДАВІНА ВЫЗВАЛЕННЯ ГОМЕЛЯ АД ГІТЛЕРАЎСКІХ АКУПАНТАЎ. ГЭТЫ ДЗЕНЬ НАЗАЎЖДЫ ЗАСТАЕЦЦА Ў ПАМЯЦІ ЎДЗЯЧНЫХ НАШЧАДКАЎ. ЯНЫ ШАНУЮЦЬ І ЗАЎСЁДЫ БУДУЦЬ УСЛАЎЛЯЦЬ ІМЁНЫ ТЫХ, ХТО ПРАЯВІЎ МУЖНАСЦЬ І ГЕРАІЗМ, КАБ НАД НАШЫМ ГОРАДАМ ЗАПАЛЫМНЕЎ СЦЯГ ПЕРАМОГІ.**


ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 17 (991) | АЎТОРАК, 21 лістапада 2000 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная


## М.В.СЕЛЬКІН — КАНДЫДАТ У ЧЛЕНЫ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

**Прэзідыум Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў і гарадскі выканаўчы камітэт вылучылі рэктара нашага універсітэта доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь СЕЛЬКІНА Міхаіла Васільевіча кандыдатам у члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.**

**Выбранне членаў Савета Рэспублікі ад Гомельскай вобласці адбудзецца 7 снежня г.г. на сумесным пасяджэнні дэпутатаў гарадскіх і раённых Саветаў.**

## ЗАПРАШАЕ КУЛЬТУРНЫ ЦЭНТР

У свой час на баланс нашага універсітэта быў перададзены будынак кінатэатра "Юбілейны" з мэтай стварэння тут культурнага цэнтра для студэнтаў і гарадской моладзі. Для ажыццяўлення праекта спатрэбілася правесці значныя рамонтныя работы. Па іх завяршэнню новая культурная ўстанова гасцінна расчыніла свае дзверы для жадаючых праводзіць тут свой вольны час.

Культурны цэнтр "Юбілейны" мае глядзельную залу на 800 месцаў, танцавальную залу на 1000 чалавек, неабходныя дапаможныя пакоі.

— Адкрыццё нашага культурнага цэнтра, — гаворыць яго дырэктар В.Зотава, — пачалося з дыскатэкі. І цяпер яны будуць праводзіцца штотыднёва па серадах, пятніцах і суботах з 19 да 22 гадзін. Плануем рэгулярна наладжваць канцэрты як прафесійных, так і самадзейных артыстаў. У перспектыве — дэманстрацыя кінафільмаў.

В.Зотава паведаміла, што асабліва насычанымі стануць пераднавагоднія і навагоднія мерапрыемствы. Яно і зразумела: мы будзем развітвацца з XX стагоддзем і ўступім ў новае тысячагоддзе. У культурным цэнтры гэтыя знамянальныя падзеі адзначаць не толькі студэнты, але і многія школьнікі нашага горада.

## ВІНШАВАЛІ ЮБІЛЯРАЎ

15-га лістапада адзначана 70-годдзе Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Гэта — адна з вядучых у нашай краіне акадэмічных навукова-даследчых устаноў, якую ўзначальвае шыро вядомы вучоны акадэмік НАНБ В.А.Іпацьеў.

На ўрачыстым пасяджэнні Савета інстытута прагучалі цёплыя віншаванні шматлікіх прамоўцаў. Ад імя калектыву нашага універсітэта выступіў рэктар, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь М.В.Селькін. Ён выказаў юбілярам найлепшыя пажаданні і ўручыў прывітальны адрас.

Фестывальны дзённік

## СВЯТА АКРЫЛЕННЯ ДУШ


(Працяг. Пачатак у №16.)


### НА СЦЭНЕ—ЛАЎРЭАТЫ

У праграму фестываля "Арт-сесія" быў уключаны канцэрт лаўрэатаў агульнауніверсітэцкага конкурсу "Ану, першакурснік! — 2000 г." Лепшыя нумары з факультэцкіх праграм, якія сёлета рыхтаваліся на тэму "Свята, якое заўсёды з намі", змаглі па вартасці ацаніць не толькі студэнты ГДУ, але і шматлікія ўдзельнікі і госці фестывалю.

Канцэрт яскрава засведчыў, што рознажанравыя мастацкія калектывы ГДУ папаўняе здольная творчая моладзь. А гэта значыць, што наш універсітэт заўсёды і можа дастойна прадстаўляць сябе ў розных конкурсах, фестывалях. "Арт-сесія" — яркае таму пацвярджэнне.

### "АРТ-ГАЛЕРЭЯ"

Сваім існаваннем выставачная зала галоўнага корпуса абавязана менавіта фестывалю "Арт-сесія". У 1996 г., калі ён праводзіўся ў ГДУ ў другі раз, расчыніла свае дзверы аматарам мастацтва — жывапісу, графікі, скульптуры, музыкі — былое неабжытае фае, якое цяпер стала сапраўдным духоўным цэнтрам не толькі нашай ВНУ, але і горада. Колькі за гэты час тут адбылося сустрэч з цудоўным, нават цяжка падлічыць.

Паклікала сюды ў чарговы раз усіх, чыя душа прагне духоўнага ўзбагачэння, "Арт-галерэя", што адкрылася ў рамках фестывалю.

... Гучыць цудоўная музыка Баха, Масне, Гендэля, Крэйслера. Навучэнкі гомельскай музычнай школы імя Чайкоўскага Наталля Цакун і Аляксандра Савіных натхнёна выконваюць творы славутых кампазітараў, і гэта стварае ў зале асаблівы настрой, які дапамагае больш глыбока зразумець, адчуць сэрцам аўтарскія задумы. Тут выставілі свае творы і пачынаючыя, і ўжо сталыя мастакі — ад 16 да 35 гадоў: В.Казлоў, У.Ліпін, І.Бярнацкая, А.Рамазанава, К.Бушынская, В.Верабʼёва, С.Радчанка. У кожнага з іх — свой почырк, індывідуальнае ўспрыняцце свету. Здзіўлялі і зачароўвалі сваім пяшчотным пералівам званочкі з керамікі, выробленыя ўмелымі рукамі А.Наўгародцава, цікавыя пано з прыроднага матэрыялу — сухіх кветак, лісця, грыбоў - трутавікоў, моху з някідкай, але гарманічна спалучанай каляровай гамай.

Было над чым падумаць, паразважаць, гледзячы на графіку з незвычайнымі элементамі (аўтар - А.Якушэнка), сацыяльныя малюнкі, палітычныя партрэты, невялічкія скульптуры студэнта матфака ГДУ У.Міроненкі.



**Прарэктар ГДУ А.В.Лысянкоў уручае дыплом фестывалю гасцям з Шатландыі.**

Знаёмства з экспазіцыяй "Арт-галерэі"— гэта спазнаванне і спасціжэнне свету цудоўнага. Менавіта дзеля гэтага і


**(Працяг на 2-стар.)**


## У ПАДТРЫМКУ ТАЛЕНАВІТЫХ НАВУЧЭНЦАЎ І СТУДЭНТАЎ

Аб правядзенні II рэспубліканскага конкурсу творчых работ студэнтаў па грамадскіх навуках "Беларусь у XXI стагоддзі"абʼявіў спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы таленавітых навучэнцаў і студэнтаў. Гэты творчы агляд стаў часткай мэтавай праграмы "Грамадазнаўству XXI стагоддзя -ініцыятыву і творчасць таленавітай моладзі Беларусі".

Стымуляваць пошукава-даследчую дзейнасць студэнтаў —такая мэта вызначана ў спецыяльным Палажэнні аб конкурсе. Згодна з ім, прыняць удзел у гэтым творчым спаборніцтве могуць студэнты ВНУ, якія прадставяць свае работы па гісторыі Беларусі, філасофіі, сацыялопі, паліталогіі, эканамічнай тэорыі, культуралогіі, праву, рэлігіязнаўству. Да конкурсных матэрыялаў прадʼяўляюцца пэўныя патрабаванні: работа павінна быць выканана самастойна і насіць індывідуальны характар, а даследаванне актуальных сацыяльна-эканамічных, палітыка-прававых і духоўных праблем павінна адпавядаць тэме конкурсу.

Агляд будзе праходзіць у тры туры. Першы пачнецца ў маі 2001 года і працягнецца да чэрвеня ў форме навуковых канферэнцый у ВНУ. Лепшыя работы трапяць на другі - абласны - тур, які завершыцца 1 кастрычніка 2001 года. Фінал трэцяга -- рэспубліканскага -- этапа адбудзецца 1 снежня.

Конкурс праводзіцца пры падтрымцы Міністэрства адукацыі, куды можна звярнуцца, каб даведацца пра падрабязнасці ўдзелу ў аглядзе, па тэлефонах 220-90-56 і 220-94-81. Свае аргкамітэты будуць створаны ў вышэйшых навучальных установах рэспублікі, пры ўпраўленнях адукацыі аблвыканкамаў і Мінскага гарадскога выканкама. Каардынаваць іх работу будзе адзіны рэспубліканскі аргкамітэт.

**БЕЛТА.**

## З узнагародай!

*Загадам па Міністэрству адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30 кастрычніка г.г. дэкан эканамічнага факультэта , загадчык кафедры эканомікі і кіравання на вытворчасці КАРПЕЙ Тамара Васільеўна ўзнагароджана нагрудным значком "Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь".*

***

*За дасягненні ў падрыхтоўцы і атэстацыі навуковых і навукова-педагагічных кадраў вышэйшай адукацыі старшыня Савета па абароне дысертацый, д.т.н., прафесар, загадчык кафедры матэматычных праблем кіравання МАКСІМЕЙ Іван Васільевіч узнагароджаны Ганаровай граматай Дзяржаўнага Вышэйшага атэстацыйнага камітэта Рэспублікі Беларусь.*

***

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці к.э.н., дацэнт кафедры "Фінансы і крэдыт" БАЛТРУШЭВІЧ Галіна Карнілаўна ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

***

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння загадчык кафедры палітычнай сацыялогіі к.г.н, дацэнт КАЧАТКОЎ Уладзімір Іванавіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта горача віншуюць нам. дэкана юрыдычнага факультэта, дацэнта кафедры грамадзянска-прававых дысцыплін ЭСМАНТОВІЧ Ірыну Ігараўну і дацэнта кафедры матэматычных праблем кіравання ЛЕЎЧУКА Віктара Дзмітрыевіча з прысваеннем ім ДзяржВАКам Рэспублікі Беларусь вучонага звання дацэнт.*

Фестывальны дзённік

# СВЯТА АКРЫЛЕННЯ ДУШ

(Працяг. Пачатак на 1-стар.)



Карціны маладых мастакоў выклікалі цікавасць у наведвальнікаў выставачнай залы ГДУ.

ішлі сюды студэнты, выкладчыкі, ўдзельнікі і госці фестывалю.

### РАЗВІТАЛІСЯ, КАБ СУСТРЭЦЦА ЗНОЎ

Расставанне заўсёды прыносіць у душу сумныя ноткі. Адчувалі іх на цырымоніі ўрачыстага закрыцця фестывалю, якая праходзіла ў зале гарадскога цэнтра культуры і вольнага часу, што па вул.Першамайскай, усе яго ўдзельнікі, госці, гледачы. Але калі на заключным канцэрце зноў загучалі песні, музыка ў цудоўным выкананні калектываў, якія гледачы паспелі палюбіць, лёгкі смутак змяніўся настроем больш узнёслым. Калі сябры развітваюцца, іх дружба выпрабоўваецца часам і мацнее яшчэ больш.У душы кожнага застаецца надзея на новую сустрэчу. Праз два гады яна абавязкова павінна адбыцца зноў на гасціннай гомельскай зямлі.

А незабыўным напамінам аб цікавых, запоўненых творчасцю днях гэтай восені, лепшым калектывам-удзельнікам "Арт-сесіі-2000" застануцца ўручаныя ім прарэктарам па культурна-асветніцкай і выхаваўчай рабоце ГДУ А.В.Лысянковым ганаровыя дыпломы і прызы.

### У СТЫЛІ МАДЭРНА

Раз"ехаліся па сваіх блізкіх і далёкіх краінах удзельнікі фестывалю "Арт-сесія". Але свята творчасці на гэтым не скончылася. Пачалася другая яго частка — "Арт-галерэя", у рамках якой праходзілі шматлікія сустрэчы з паэтамі, мастакамі, бардамі. Запрасілі ў свае выставачныя залы Паляўнічы домік і Саюз мастакоў.

На вечар прэм"ер "Мадэрн", які праходзіў у рамках "Арт-галерэі" у зале ГЦКіА па вул. Першамайскай, сабраліся сапраўдныя аматары сучаснай харэаграфіі і музыкі. Свой прэм"ерны спектакль — аднаактовы балет "Адпаведнасць" вынесла на суд гледачоў удзельніца і дыпламант многіх міжнародных фестываляў гомельская група "Квадра" (кіраўнік Іна Асламава). Па-свойму цікавая, арыгінальная пластыка рухаў удзельніц калектыву, своеасаблівае музычнае суправаджэнне дзеяння адрознівала спектакль ад традыцыйнага, класічнага балета. Гэтым і цікавая група, якая шукае і знаходзіць свае фарбы і адценні ў харэаграфіі.

Авацыямі сустракалі кожную кампазіцыю ў выкананні гомельскай спявачкі — лаўрэата міжнародных конкурсаў аўтарскай і эстраднай песні Зоі Гарынай. У суправаджэнні электрагітары гэтая добра вядомая за межамі Беларусі аўтар і выканаўца сваіх блюзавых кампазіцый бліскуча праспявала песні, якія ўвашлі ў яе новы альбом "Улыбка луны". У іх — глыбокія філасофскія разважанні, летуценнасць разам з крыху прыземленымі назіраннямі за паўсядзённым у нашым жыцці. Яе песні знайшлі гарачы водгук у сэрцах гледачоў, якія неаднаразова выклікалі аўтара "на біс".

З.Гарыну добра ведаюць аматары аўтарскай песні ў з г.Санкт-Пецярбургу, дзе ў яе шмат сяброў-аднадумцаў. Адна з іх — спявачка Алена Кантар прыехала на гэты канцэрт , дзе пранікнёна выканала песні на вершы Зоі.

Цікава паказаў сябе яшчэ адзін калектыў сучаснай харэаграфіі з г. Гродна —"Тад". Выкананыя ім чатыры мініяцюры ўносілі гледачоў далёка ад рэальнасці — у свет фантазіі і мрояў. А вярнула іх з яго ў нашу паўсядзённасць, дзе шмат яшчэ, на жаль, сумнага, харэаграфічная кампазіцыя, прысвечаная ўсім тым, каго забраў у невядомасць сёлетні трагічны месяцы жнівень. Гледачы атрымалі вялікае ўзрушэнне ад убачанага на сцэне, настолькі шчымліва дакладна мовай рухаў паказалі маладыя артысты, як балюча страчваць самых дарагіх нам людзей, якія яшчэ многае не паспелі зрабіць у сваім жыцці.



Удзельнікі балета сучаснай харэаграфіі з г.Гродна ў час выступлення на адкрыцці "Арт-галерэі".

Удзельнікі вечара прэм"ер атрымалі пасля канцэрта ганаровыя дыпломы "Арт-галерэі — 2000" з прысваеннем звання лаўрэатаў.

### НАТХНЕННЕ ЧАСУ

Менавіта такую назву атрымаў у фестывальнай праграме паказ калекцый адзення маладых мастакоў-мадэльераў. І гэта было , бадай, самае прыгожае і відовішчнае дзейства з усіх мерапрыемстваў "Арт-галерэі".

Мы думаем пра будучае, але не павінны забываць і пра мінулае, каб узяць з яго з сабой у век наступны ўсё лепшае і рацыянальнае. І мода тут — не выключэнне. Гэта імкнуліся паказаць маладыя таленты з амаль усіх эксперыментальных лабараторый г.Гомеля.

Змяняліся на подыуме прыгожыя, грацыёзныя дзяўчаты і юнакі, апранутыя ў адзенне, народжанае ад палёту бясконцай фантазіі сапраўдных творцаў, якія паспелі выдатна сябе зарэкамендаваць на розных конкурсах мадэльераў не толькі ў нашай рэспубліцы, але і за яе межамі.

Свае цудоўныя калекцыі прадставілі А.Шыловіч, Т.Давыдзенка, Н.Сауціна, Н.Жукава (эксперыментальная лабараторыя адкрытага акцыянернага таварыства "Камінтэрн"), Л.Святланава, В.Корбут, Г.Драбышэўская (ААТ "8 Сакавіка"), І.Буднікава (аб"яднанне "Гомельтрыкатажбыт"), А.Каратаева, І.Горленка ( аб"яднанне "Элегант"), навучэнка прафтэхвучылішча №20 бытавога абслугоўвання Святлана Карачанцава (дарэчы, выпускніца біяфака ГДУ, інтэрв"ю з якой чытайце на 3-й стар. газеты) і інш.

Багацце ўбачаных у той вечар мадэляў захапляла не толькі сваімі лініямі, гамай тканін, але і назвамі — "Лён на рубяжы стагоддзяў", "Балтыйскі сон", "Дзяўчына-вясна", "Кантры", "Галівуд", "Яна", "Іспанія", "Дзелавыя сустрэчы", "Стыхія", "Зігзаг удачы".

Асаблівае захапленне выклікалі маленькія дэманстратары адзення — вучні малодшых класаў СШ №35 г.Гомеля, у якой створаны свой дзіцячы тэатр мод.

Пра мастака-мадэльера Валянціну Шапавалаву варта сказаць асобна. Яна вельмі ціка-



Гэты інтрыгуючы бодзі-арт...

(Заканчэнне на 4-стар.)

КАНФЕРЭНЦЫІ

# ПРЫСВЕЧАНА ЮБІЛЕЮ ТЭХНАЛАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Нядаўна ў г.Мінску на базе БДТУ прайшла міжнародная навукова-тэхнічная канферэнцыя "Аўтаматычны кантроль і аўтаматызацыя вытворчых працэсаў", прысвечаная 70-годдзю універсітэта. Яе арганізатарамі з"яўляліся Міністэрства адукацыі краіны і Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт.

На 5 секцыях канферэнцыі было заслухана і абмеркавана звыш 90 дакладаў вучоных з розных рэгіёнаў Беларусі, Расіі, Украіны, а таксама Польшчы, Францыі. 8 дакладаў былі заяўлены ад ГДУ імя Ф.Скарыны.

Тэматыка прадстаўленых на канферэнцыю работ была вельмі шырокай і прысвячалася праблемам пабудовы аўтаматычнага кантролю тэхналагічных параметраў неразбуральнымі метадамі на аснове электрамагнітных выпраменьванняў у ўльтрагукавым, аптычным і рэнтгенаўскім дыяпазоне, сістэм кіравання на аснове структурна-параметрычнага сінтэзу для розных крытэрыяў якасці, матэматычных метадаў аналізу і сінтэзу лінейных сістэм кіравання і інш.

Выдадзены зборнік матэрыялаў канферэнцыі.

Па праблемах экалогіі

# АБ"ЯДНАНЫМІ НАМАГАННЯМІ

У апошнія гады на тэрыторыі Беларусі, якая пацярпела ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, а таксама ў выніку шырокамаштабнай асушальнай меліярацыі, хімічнага забруджання ўсіх асяроддзяў жывых арганізмаў, прыкметна абвастрыліся экалагічныя праблемы. Назіраецца рост генетычных захворванняў і аслабленне імунітэту ў насельніцтва. Сярод аб"ектаў жывой прыроды на фоне павелічэння зменлівасці жыццёваважных параметраў арганізмаў адбываецца больш жорсткі стабілізуючы адбор, накіраваны на забеспячэнне цэласнасці і стабільнасці экасістэм. Асаблівую трывогу выклікаюць працэсы, якія развіваюцца на тэрыторыях, што выведзены з гаспадарчага абароту ў выніку хімічнага, у тым ліку радыеактыўнага забруджання.

Высненню механізмаў змяненняў, якія працякаюць на гэтых і іншых тэрыторыях, была прысвечана ІІ Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Экалагічныя праблемы Палесся і сумежных тэрыторый", якая нядаўна праходзіла ў нашым універсітэце. На яе было заяўлена звыш 110 дакладаў з 22 навукова-даследчых устаноў і ВНУ як нашай рэспублікі, так і блізкага замежжа. Сярод іх — Інстытут эксперыментальнай батанікі, Інстытут заалогіі, Інстытут лесу НАН Беларусі, Інстытут праблем экалогіі і эвалюцыі імя А.Н Северцава Расійскай акадэміі навук, усе універсітэты нашай рэспублікі.

На пленарных і пяці секцыйных пасяджэннях было заслухана 67 дакладаў. Найбольш поўна на канферэнцыі абмяркоўваліся агульнаэкалагічныя праблемы Палесся, водных экасістэм, пытанні экалогіі раслін, пазваночных і беспазваночных жывёл наземных экасістэм. Асаблівае месца занялі праблемы экалогіі тэрыторый, забруджаных радыенуклідамі і выведзеных з гаспадарчага абароту. Трэба адзначыць, што ў час выступлення ўдзельнікі канферэнцыі гаварылі не толькі аб праблемах, механізмах працякаючых змен, але і прапаноўвалі варыянты вырашэння праблем.

Удзельнікам канферэнцыі была прапанавана разнастайная культурная праграма. Так, некаторыя з іх наведалі мерапрыемствы фестывалю "Арт-сесія", а для большасці была арганізавана паездка ў Веткаўскі музей народнай творчасці.

Канферэнцыя эколагаў стала пастаяннай навуковай падзеяй, дзе вучоныя могуць не толькі абмяняцца вынікамі даследаванняў, але і скаардынаваць планы работ і ў выніку павысіць эфектыўнасць экалагічных даследаванняў, якія праводзяцца ў рэспубліцы і сумежных дзяржавах.

**А. КУСЯНКОЎ,**
**загадчык кафедры экалогіі, дацэнт.**

Выставы

# СВАЕ ДАСЯГНЕННІ ДЭМАНСТРАВАЛІ ВНУ

У Беларускім дзяржаўным універсітэце прайшла трэцяя міжнародная выстава "Вузаўская навука: прыборы, тэхналогіі, матэрыялы, праграмнае забеспячэнне".

Экспанаты для выставы былі адабраны па трох тэматычных раздзелах: "Малатанажная хімія", "Аналітыка і аналітычнае прыборабудаванне", "Камп"ютэрныя тэхналогіі". У першым з іх выстаўлялася прадукцыя прадпрыемстваў і навуковых арганізацый, ВНУ (рэчывы розных класаў, кампазіцыі рознага функцыянальнага прызначэння), а таксама тэхналогіі для яе малатанажнай вытворчасці. Тэматычная экспазіцыя па аналітычнаму прыборабудаванню ўключала прыборы, праграмна-аналітычныя комплексы, электронныя камплектуючыя, стандартныя ўзоры саставаў, расходныя матэрыялы, методыкі пробаадбору і праўдзення аналізаў, паслугі ў гэтай галіне.

Найбольш прадстаўнічай была экспазіцыя "Камп"ютэрныя тэхналогіі", сфарміраваная па напрамках: інфармацыйныя тэхналогіі ў давузаўскай адукацыі, інфармацыйныя тэхналогіі для прадстаўнікоў розных дысцыплін ВНУ, дыстанцыйнае навучанне і тэсціраванне, інтэрнет-тэхналогіі, WEB-студыі, АСК ВНУ, навукаёмістыя камп"ютэрныя тэхналогіі і сістэмы прыняцця рашэнняў.

Выстава выклікала жывую цікавасць у выкладчыкаў, вучоных, студэнтаў ВНУ Мінска, спецыялістаў прамысловых прадпрыемстваў і арганізацый рэспублікі, замежных гасцей. Тэматычная накіраванасць яе раздзелаў адпавядала асноўным сучасным тэндэнцыям развіцця і ўкаранення прыкладных даследаванняў і распрацовак ВНУ. Таму ўдзел ў традыцыйнай выставе дазволіў яе ўдзельнікам і гасцям не толькі атрымаць неабходную інфармацыю, але і ажыццяўляць кантакты, наладжваць сувязі для пашырэння і паглыблення даследаванняў, укаранення навукова-тэхнічных дасягненняў у вытворчасць, адукацыю, іншыя сферы дзейнасці. Наладжванню кантактаў, развіццю сувязей ў значнай ступені садзейнічалі тэматычныя семінары, прэзентацыі экспанатаў, якія праводзіліся на выставе.

Наш універсітэт быў прадстаўлены распрацоўкамі матэматычнага, фізічнага факультэтаў, інфармацыйна-вылічальнага цэнтра. ПНДЛ перспектыўных матэрыялаў дэманстравала ўзоры паліравальных суспензій для апрацоўкі пласцін з крэмнія, кафедра агульнай фізікі — праграмы па рашэнню фізічных задач, кафедра вылічальнай матэматыкі і праграміравання — праграмны комплекс для кантролю і дыягностыкі трубаправодаў прамысловых прадпрыемстваў, ІВЦ — праграмныя прадукты па распрацоўцы, сімуляцыі, адладцы апаратнага і праграмнага забеспячэння мульціпрацэсарных сістэм. Праяўленню цікавасці да экспанатаў універсітэта садзейнічала актыўная дзейнасць стэндыстаў: навуковага супрацоўніка В.Гайшуна, інжынера-матэматыка А.Карнейчука, аспірантаў А.Кавалёва і В.Шчэрбы.

За актыўны ўдзел у выставе наш універсітэт узнагароджаны дыпломам.

**М.ЯРМАЛКЕВІЧ, вядучы інжынер НДС.**

*Согласитесь, что нет такой девушки, которая за всю свою сознательную жизнь ни разу не держала иголку в руках. Я уже не говорю о "конструировании" косынок и передников на уроках труда в школе. Для кого-то шитье стало любимым делом, увлечением; для кого-то работой. Но лишь единицы "кройку и шитье" превратили в искусство, профессионализм, в то, что называется "лицом моды". Это талантливые, неординарные личности, для которых создавать одежду стало образом жизни. Имя им — модельеры. Вдвойне приятно, что и в нашем городе живет и творит молодой очаровательный модельер, устремленный человек, интересная собеседница и, между прочим, — выпускница нашего университета, вечный студент (как она сама себя называет) Светлана Караченцева. За плечами у нее Лоевское педучилище, десять лет работы в школе, биофак ГГУ и в данный момент Света учится в Гомельском профтехучилище бытового обслуживания № 20, которое приблизило ее к осуществлению заветной мечты — показу ее моделей. С большим успехом Светины модели были продемонстрированы минувшим летом у кафе "Титаник", и позже Света участвовала в акции "Гомельская праўда" збірае сяброў".*

# ИДТИ К НАМЕЧЕННОЙ ЦЕЛИ...

Я предложила своей собеседнице рассказать о себе, своих планах и, конечно, раскрыть секреты моды и красоты. К нашей беседе любезно присоединилась Светина наставница, мастер гр.№ 15 Римма Аркадьевна Бородич.

*— Светлана, с чего начался твой путь в мир моды?*

— Все начиналось постепенно, исподволь. Это только кажется, что человек получает результаты вдруг, неожиданно. В моем примере желание шить было заложено где-то в генах. Моя прабабушка была модисткой, и сейчас в доме как реликвия хранится ее довоенный "Зингер" (между прочим, до сих пор работает). И вообще, в доме у нас все женщины всегда умели шить, у всех есть персональная швейная машинка.

*— Скажи, пожалуйста, как к тебе приходят твои модели? Это какие-то образы, ассоциации?*

— Помнишь, как у Ахматовой: "Когда б вы знали, из какого сора...". Иногда идешь по улице, видишь где-то совершенно не различимый силуэт. Взгляд уловил — а воображение уже дорисовало нужные линии. Но в принципе в сознании уже должна быть идея, которую порою долго вынашиваешь. Кристиан Диор говорил, что до сорока лет он и не помышлял о моде, а потом платья на него буквально набросились. У меня примерно также. Бывает, что я закрываю глаза и вижу платья.

*— Кто помогает тебе осуществлять кропотливую работу по созданию твоих моделей? Есть ли у тебя постоянная команда?*

— Конечно, есть. Это — девушки из моей группы, которые очень мне помогают. Я им благодарна за это. Особо хочу отметить мастера моей группы № 15 Римму Аркадьевну Бородич, без которой моя коллекция не состоялась бы, а осталась на листочках. Только ее желание, инициатива помогли осуществлению моего показа. Было очень сложно, ведь модели, по сути экспериментальные. Нужно было заново разрабатывать конструкции, придумывать обработку. Даже не верилось, что мы, наконец, закончили.

**Р.А.Бородич:**

— Я случайно заметила у Светы эскизы и предложила сделать коллекцию. Потому что то, что я увидела, мне показалось новым, необычным. Уверена, что Светина коллекция не может никого оставить равнодушным. Конечно, при работе мы столкнулись с трудностями. В первую очередь — проблемы с финансами. Спасибо, помогло управление образования, наше училище. Сами бегали по магазинам, частным предпринимателям, выбирали ткани. Очень сложно работать, так как нет соответствующего оборудования, прикладных материалов.



***На снимке:*** *модель из коллекции Светланы Караченцевой.*

Девочки где-то выискивали литературу по обработке, вышивке бисером и т.д. Только большое желание помогло нам преодолеть все трудности и представить Светину коллекцию.

*— Римма Аркадьевна, легко ли вам работается вместе со Светой?*

— Я бы не сказала, что Света простой человек. Но мне нравится, что она добивается своей цели, умеет отстоять свои взгляды. Конечно, мы спорим, доказываем что-то друг другу. Но я придерживаюсь правила: если учащийся в конечном результате прав, я только рада. Ведь если он спорит, значит ему интересно и он знает толк в нашем деле.

*— Каковы планы на будущее? Где можно увидеть ваши модели?*

— Мы не собираемся останавливаться. Участвуем в республиканском конкурсе молодых дизайнеров одежды, который является полуфиналом международного конкурса "Новая Россия — XXI век", проводимым благотворительным фондом "Русский силуэт". Недавно принимали участие в "Арт-сессии" в родном ГГУ.

*— Света, обращаешь ли ты внимание на то, как одевается молодежь Гомеля?*

— Только на это и обращаю (смеется). Конечно, есть у нас люди, которые одеваются стильно. Может быть их одежда и не очень дорогая, но выдержана в одном стиле, грамотно подобраны все детали. Те же, кто одевается "с базара", в глаза не бросаются. Такие люди не отличаются от большинства.

*— Можно ли приобрести твои модели?*

— Мы только начинаем, но если у кого-то возникнет желание, можно прийти в училище в нашу группу и сделать заказ. Мы с удовольствием его выполним.

*— На какой стиль ты ориентируешься при создании своих моделей?*

— Мне нравится романтический, элегантный стиль, но в последнее время перехожу на спортивный.

*— Это что, влияние времени?*

— Да, потому что спортивный стиль удобен. Он проникает во все стили и направления. Люди ищут комфорта и легкости. В настоящее время существует тенденция использования элементов спортивного стиля даже в вечерней одежде, выполненной из дорогостоящих тканей. Человеку всегда хочется разнообразия.

*— Какие цвета, тона ты предпочитаешь?*

— Мне нравятся тона, которые сочетаются друг с другом. Не важно, желто-зеленый или красно-оранжевый. Главное, чтобы они гармонировали.

*— Светлана, согласна ли ты с утверждением: главное не то, как ты выглядишь, а то, как ты себя чувствуешь?*

— Я думаю, что важно и то, и другое. Если ты выглядишь плохо, то и чувствуешь себя соответственно. И наоборот.

**— Что ты посоветуешь тем молодым людям, которые обладают какими-то незаурядными способностями, но не имеют возможности представить их на суд обществу?**

— Во-первых, под лежачий камень вода не течет. Чтобы себя проявить, надо что-то делать. Я вот не побоялась: перечеркнула все десять лет работы в школе. У Э.Рязанова, помнишь: "Не бойтесь все на карту бросить, пытайтесь жизнь переменить...".

*— Что можно носить этой осенью?*

— Это опять-таки одежда, выдержанная в спортивном стиле. И может быть даже стиль диффузный, с элементами спортивного. В первую очередь, одежда должна быть качественно выполнена и, конечно, удобной, и комфортной.

*— Твои модели в основном для женщин?*

— Да, летняя коллекция ориентирована на молодых женщин, но в следующую коллекцию планирую ввести мужские модели. Думаю, это внесет некое разнообразие. Мужчина, который находится рядом с прелестной женщиной, должен ей соответствовать.

*— Твои пожелания студентам нашего университета.*

— Студентам университета я хочу пожелать не сворачивать с намеченного пути, добиться поставленных целей. Кому-то получить диплом, кому-то сделать карьеру. И иметь силу воли, чтобы противостоять тем условиям и неудобствам, в которых мы живем, и добиться успеха в жизни.

**Р.А.Бородич:**

— Такие учащиеся как Света бывают очень-очень редко.

**От автора:**

— Добавлю, что повезло всем гомельчанам, потому что они могут гордиться своей талантливой землячкой. Пожелаем Свете творческих успехов, свежих идей и легких дорог. А профтехучилище № 20 пусть радует нас новыми талантами.

**Татьяна ЦЕЛЕХОВИЧ,**
**студентка гр.РБ-33 филологического факультета**

# РАЗАМ З ФРАНЦЫСКАМ СКАРЫНАЙ У ЦАРСТВА ВЕДАЎ

**28-га лістапада — 12 гадоў, як наш універсітэт з гонарам носіць імя карыфея беларускай культуры. Ф.Скарыну па праву можнаназваць першым Настаўнікам свайго народа. Сам ён добра ўсведамляў гэта. На вядомым партрэце асветніка ў перакладзенай і выдадзенай ім у 1517 годзе кнізе "Іісус Сірахаў" Ф.Скарына адлюстраваны ў выглядзе легендарнага біблейскага культурнага героя Еноха. Адно са значэнняў гэтага імя — Настаўнік.**

У кнізе "Іісус Сірахаў" Енох названы першым у шэрагу людзей, якія заслугоўваюць вечную памяць у свайго народа. Як раз у канцы гэтага пераліку біблейскіх герояў і "малітвы" Іісуса Сірахава змешчаны славуты партрэт першадрукара. Так званая малітва Сірахава па сутнасці малітвай не з'яўляецца. Гэта зварот да моладзі з заклікам быць адукаванымі.

Адзін з ініцыялаў выданняў Скарыны ўпрыгожаны салярным партрэтам асветніка ў выглядзе Еноха. Ініцыял літары О йётаваны і ў кірылічнай азбуцы завецца Ён.

Асветніцкая сімволіка знака "вагі" і сыгнета Ф.Скарыны пацвярджаецца выяўленчымі ідэаграмамі старэйшага яго сучасніка славутага нямецкага мастака А.Дзюрэра.

Галоўны змест знака "вагі" Т — чалавек каля Брамы Святла — Δ (дэльта) — увахода ў Царства ведаў, якое, у сваю чаргу, адлюстравана на сыгнеце ў выглядзе месяца. Сонейка і месяц сімвалізуюць перадачу і атрыманне ведаў — дактрыну і дысцыпліну. У сваёй прадмове да кнігі "Плач Иеремии", якая лічыцца ключом да эзатэрычнага зместу тэкста Біблії, Скарына тлумачыць сімволіку ўсіх 22 літар. За выключэннем першай літары алеф гэта сімволіка адпавядае сімволіцы ў сучасных выданнях Кабалы. У кабалістычнай традыцыі гэта літара адпавядае Кароне, якая ўраўнаважвае мудрасць і розум. Звычайна яе адлюстроўвалі ў выглядзе яркага святла або сонечнай кароны. Скарына называе літару А (алеф) — навукай. У той час паняцце навукі не насіла эўрыстычны характар. Гэта хутчэй эквівалент слова дактрына.



На славутай гравюры



А.Дзюрэра "Меланхолія", створанай на тры гады раней партрэта Скарыны, ідэаграма ўваходу ў Царства ведаў перададзена выявай паглыбленага ў сцяне вядомага "магічнага" квадрата з дзвярным званочкам над ім. Сума 34, якая атрымліваецца на любой гарызанталі, вертыкалі ці дыяганалі квадрата, адпавядае літарам Л-30 і Д-4, якія ў сваю чаргу сімвалізуюць вучонага, выхаванне і Браму Святла. Брама Святла ў выглядзе брамы на воблаку адлюстравана на гравюры мастака з выявай яго герба.

На "Меланхоліі"— выява тачыльнага дыску (адточвае розум). Лацінскае disco — навучыцца чаму-небудзь (часткова прыкрыта тканінай і вышчарблена. Гэта метафарычны месяц —Царства ведаў. На дыску сядзіць маленькі путта і рашае нейкую задачу. Італьянскае Putto праз лацінскае Puto ствараe ідэаграму думаць і лічыць. Адлюстраванне вялікіх вагаў над ім сімвалізуе Карону, якая ўраўнаважвае Мудрасць і Розум. Левая талерка гэтых сімвалічных вагаў — (Біна-розум, развіццё) датыкаецца галавы путта.

Бярэта Скарыны датыкаецца жолуд. Партрэт беларускага першадрукара стварaўся ў нямецкамоўнай на той час Празе. Партрэт рэпрэзентаваў Скарыну ў тым ліку і інтэлектуалам, не ведаючы роднай мовы асветніка. Адукацыя тых далёкіх часоў была пераважна філалагічнай. Для тых часоў характэрны вялікая культура тэксту і слова, увага да яго Літары ў пошуку Сэнсу. Мысленне людзей таго часу было вельмі метафарычным. Жолуд — нямецкае Elchel — утрымлівае словы El — яйка і hell —яркі (аб святле). Хель сугучна Геліасу, heil —лекавы (сродак). Такім чынам выява жолуда — своеасаблівы дублікат сыгнета беларускага першаасветніка.

На партрэце Скарыны адлюстраванне капітэляў — маленькіх калонак Еноха (на іх ён накрэсліў першыя знакі пісьменства) упрыгожаны выявай яек. На іх сядзяць фігуркі львоў, сімвалізуючых вучоных (веды — магутнасць, стары дэвіз інтэлектуалаў). Яны сімвалізуюць генезіс вучоных, звяном у непарыўным ланцугу якіх лічыў сябе беларускі першадрукар.

Скарына працаваў у імя будучыні. На ініцыяле літары П, якім пачынаецца глава 49 "Іісуса Сірахава" і слова ПАМЯЦЬ, адлюстраваны пясочны гадзіннік, верхняя камера якога і паўкруглая перакладзіна літары — сімвалы БУДУЧЫНІ. Ніжняя камера — сімвал былога, з якога прарастае расток у БУДУЧЫНЮ. Гэта разумнае, добрае, адвечнае, якое насеяў наш першадрукар.

**Мікалай ПАЛКОЎНІЧЭНКА,**
**мастак.**
**Таццяна КАХАНОЎСКАЯ,**
**выпускніца ГДУ.**

# ДЛЯ ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ

Напачатку лістапада ў г.Мінску адбыліся VII Свята-Ефрасінеўскія педагагічныя чытанні "Традыцыі і перспектывы праваслаўнай адукацыі ў надыходзячым тысячагоддзі". Ад нашага універсітэта ў іх прынялі ўдзел доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай мовы У.В.Анічэнка і старшы выкладчык кафедры ўсеагульнай гісторыі Я.А Броўкін. На секцыі вышэйшай школы і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў яны выступілі адпаведна з дакладамі: "Царкоўны руска-беларускі слоўнік " (па заказу Беларускай праваслаўнай царквы пад кіраўніцтвам Уладзіміра Васільевіча складаецца ў нашым універсітэце) і "Хрысціянская духоўная ідэя супраць дзэн-будызму ( з вопыту работы са студэнтамі)".

Супрацоўніцтва царквы з сістэмай адукацыі ў нашай краіне, як адзначалася на педагагічных чытаннях, можа і павінна стаць асновай духоўнага і маральнага адраджэння грамадства.

**Кнігі нашых вучоных**



# ДЛЯ СПАЗНАННЯ НЯЗВЕДАНАГА

Яшчэ зусім нядаўна ў дапытлівай і самастойна думаючай часткі студэнцкай моладзі былі "халаднаватыя" адносіны да сацыяльна-палітычных дысцыплін. Прычынамі такога скепсіса выступалі пераважнасць традыцыяналізму над навізной у пастаноўцы і растлумачэнні праблем, слабая сувязь паміж тэорыяй і практыкай. Што ж тычыцца філасофіі, дык для некаторых гэты прадмет з'ўляецца незразумелым, уяўляецца гаварыльняй, далёкай ад істотных жыццёвых задач. У многіх людзей яшчэ не "выветрылася" думка, што філасофія быццам уяўляе сабой аўтаномнае царства розуму, не мае ўласных рэальных праблем. Аўтарытэт філасофіі паніжаўся з-за вульгарных, некампетэнтных адносін да некаторых дасягненняў прыродазнаўства і тэхнікі: генетыкі, кібернетыкі і г.д. Адарванасць ад жыцця іншы раз абарочвалася ў празмерную прыцягальнасць да практыкі, утылітарызм. Пераадоленне элементаў дагматызму і схалістыкі, адарванасці ад дасягненняў сусветнай навукі і грамадскай думкі, зварот да актуальных, гуманістычных, экалагічных і іншых праблем заклікаваны павысіць пазнавальную цікавасць да філасофіі кожнага, хто яе вывучае.

Г.Гегель у сваіх лекцыях па гісторыі філасофіі меркаваў, што тое, аб чым нічога не ведаеш, нельга ні любіць, ні ненавідзець. Вынесці свае ўзважаныя адносіны да філасофіі — азначае вывучыць яе асновы. Вучэбны дапаможнік доктара філалагічных навук прафесара, акадэміка Міжнароднай акадэміі акмеалагічных навук, акадэміка Беларускай акадэміі сацыяльных навук, загадчыка кафедры філасофіі нашага універсітэта У.М.Калмыкова "Основы философии", які нядаўна аддрукаваны ў выдавецтве "Вышэйшая школа" (Мінск) з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, і зусім нядаўна стаў здабыткам чытачоў, у пэўнай ступені вырашае гэту задачу.

У дапаможніку шырока выкарыстаны матэрыялы навуковых публікацый і падручнікаў, выдадзеных за апошнія гады ў Расіі, Беларусі і на Украіне. Па шэрагу пытанняў зроблена спроба канцэптуальна ўзбагаціць асобныя філасофскія палажэнні. Выкарыстаны ідэі, асабліва па праблемах сацыяльнай філасофіі, антрапалогіі і дыялектыкі, выкладзенай аўтарам больш чым у 140 навуковых публікацыях, у тым ліку ў 7 манаграфіях і артыкулах у зборніках (МДУ, БДУ і інш.), часопісах ("Философские науки", "Социально-политические науки", "Социально-политический журнал", "Беларуская думка").

Аўтар зыходзіць з таго, што неабходна арыентацыя на пэўны мінімум ведаў па ўсяму курсу філасофіі, зварот да класікі (праблематыка філасофіі фарміравалася на працягу больш 2,5 тыс. гадоў) і разам з тым да навейшых дасягненняў у галіне навукі і філасофскай думкі. Комплекснае ўяўленне аб філасофіі знайшло сваё адлюстраванне ў раздзелах дапаможніка "Самавызначэнне філасофіі і яе гісторыя", "Анталогія", "Дыялектыка", "Гнасеалогія", "Сацыяльная філасофія", "Гістарычны працэс. Футуралогія. Глабальныя праблемы" і іншых.

Сучасная філасофія (асабліва постмадэрнізм) пазбягае ўсіх форм манізма і універсалізацыі, апавяшчае множнасць, канкурэнцыю філасофскіх вучэнняў і навуковых канцэпцый, што мае на ўвазе пераацэнку фундаменталізму, прызнанне мнагамернага вобраза рэальнасці і адпаведнай множнасці пісанняў і пунктаў гледжання. Разам з тым, плюралізм здольны нараджаць уседазволенасць, бязмежнасць, інтэрпрэтацыю. Выхад бачыцца ў тым, каб сумясціць магчымасць для знаёмства студэнтаў з рознымі філасофскімі падыходамі з пэўнай метадалогіяй. У якасці той аўтар выбраў дыялектыка-матэрыялістычную арыентацыю. Яна абапіраецца, але не зводзіцца да марксізма-ленінізма, пераадольвае яго асобныя памылкі і недахопы, творча засвойвае дасягненні сучаснай навукі і філасофскай думкі (у тым ліку ідэалістычнай). Напрыклад, на апрацоўкі аналітычнай і лінгвістычнай філасофіі, фенаменалогіі, кібернетыкі, тэорыі інфармацыі, сінергетыкі і г.д. Праблемам сінергетыкі, якая бурна развіваецца ў апошнія 30 гадоў, у дапаможніку ўдзелена асабліва шмат увагі. Арыентацыя на дыялектыка-матэрыялістычную метадалогію не выключае ва ўмовах духоўнага плюралізма фарміраванне поглядаў, якія дапускаюць варыянтнасць светапоглядавых пераваг. Самастойныя роздумы над матэрыялам садзейнічаюць развіццю свабоднага і творчага мыслення навучэнцаў.

Аўтар дапаможніка зыходзіць з таго, што гісторыя філасофскіх ідэй арганічна ўплецена ў тэарэтычны матэрыял па філасофіі. Філасофскае самапазнанне цесна ўзаемазвязана са светаразуменнем. Прыпадаючы да сваіх крыніц, філасофія падыходзіць да разумення глыбінь Універсума, чалавека і чалавечнасці. Акрамя асобнага раздзела па гісторыі развіцця філасофскіх вучэнняў, кожная тэарэтычная тэма (аб быцці, матэрыі, прыродзе, свядомасці, дыялектыцы, чалавеку, асобе, культуры, грамадстве) пачынаецца з гісторыка-філасофскага аналізу адпаведнага паняцця.

Сучасная рэчаіснасць дыктуе неабходнасць думаць і дзейнічаць канструктыўна-крытычна, творча, дыялектычна. Засваенне філасофіі дапамагае авалодаць гэтым мастацтвам.

У.М.Калмыкоў прапануе разглядаць свой вучэбны дапаможнік як адну з папярэдніх ступеняў па фарміраванню прымальнай інварыянтнай структуры выкладання філасофіі. Філасофскія абагульненні і дакладная метадалогія дапамагаюць накіраваць пошукі на правільнае адлюстраванне навейшага этапу ў гісторыі, даць чалавеку асноўныя каштоўнасна-светапоглядавыя арыентацыі ў сённяшнім складаным свеце, прагназаваць яго далейшую дынаміку.

На жаль, вельмі карысны і папулярна напісаны дапаможнік выдадзены нязначным тыражом — усяго 1000 экземпляраў. Азнаёміцца з ім можна толькі ў чытальных залах ВНУ і публічных бібліятэках. Вельмі пахвальна, што аўтар працуе над яго дапаўненнем для новага выдання.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

**Фестывальны дзённік**

# СВЯТА АКРЫЛЕННЯ ДУШ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-2 стар.)**

ва і плённа працуе не толькі ў традыцыйнай модзе, але з'яўляецца прадстаўніцай такога пакуль што многім невядомага напрамку стылю як бодзі-арт (даслоўна, мастацкі роспіс на целе чалавека). Сказаць словамі пра тое, што было паказана на подыуме, значыць, не сказаць нічога. Трэба бачыць гэтую дзіўную фантазію малюнкаў і фарбаў на ўласныя вочы. А выканана яна была В.Шапавалай разам з Валерыем Шоманам.

Рэальны і фантастычны свет... Дзіўны, чароўны, прыгожы... У такіх вымярэннях паўстаў ён перад намі ў той вечар на подыуме актавай залы ГДУ.

**Замест пасляслоўя**

Гэтыя нататкі, што ўвайшлі ў фестывальны дзённік, канешне, не даюць поўнага адлюстравання шырокай праграмы "Арт-сесіі". Паспець убачыць усё было немагчыма, бо былі супадзенні ў адзін дзень двух канцэртаў. Аднак, мне думаецца, аб больш значным чытачы газеты, якім не давялося трапіць на мерапрыествы фестывалю, даведаліся. Можна яшчэ нагадаць, што цікавым атрымаўся творчы вечар вядомага ў СНД барда з Адэсы Віктара Байрака, а таксама фестываль тэлевізійных праграм, у якім прынялі ўдзел маладыя журналісты Беларусі. Многія тэлепраекты атрымалі дыпломы "Арт-галерэі-2000", сярод іх і праграмы "Тэледах", "Эрудыт-лато" Гомельскай студыі тэлебачання.

Дзеля аб"ектыўнасці, трэба сказаць і аб адмоўных момантах, якіх, на жаль, у арганізацыі сёлетняй "Арт-сесіі" хапала. Адчуваліся яўныя недапрацоўкі аргкамітэта ў размеркаванні запрашальных білетаў і іх продажу на канцэрты непасрэдна ў калектыве нашага універсітэта, як галоўнага арганізатара такога маштабнага мерапрыемства. Чаму пры такім ажыятажы на гэтыя білеты (уяўным ці сапраўдным?) некаторыя канцэрты праходзілі ў паўпустых залах? Горкі "сюрпрыз" атрымалі таксама гледачы, якія вельмі хацелі паглядзець выступленні мінскай студыі балета А.Духавай "Тодес" і групы "Ляпис Трубецкой", як гэта было абяцана ў праграме "Прывітанне, фестываль!" — канцэрт сарваўся. Не адбываліся і запланаваныя дыскатэкі для студэнтаў...

Калі ўлічыць, што фестываль "Арт-сесія" — па ліку ўжо чацвёрты, і пэўны вопыт ў яго арганізацыі, канешне, павінен быць, пралікаў і недапрацовак, якія многім сапсавалі настрой, можна было б дапусціць намнога меней.

**Т.ДУБЯК.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

**Інтэрнат -- твой дом**

# І ЗАВІТАЎ У ГОСЦІ "ПАЛІТЭХ"

Сяброўству і ўзаемаадносінам паміж студэнтамі гомельскіх ВНУ быць! Менавіта пад такім лозунгам адбыўся ў пачатку лістапада традыцыйны "Вечар знаёмстваў першакурснікаў" у інтэрнаце №1 нашага універсітэта. Усю незвычайнасць і нейкую па-сяброўскаму ўрачыстую атмасферу надалі святу запрошаныя госці — студэнты-жыхары інтэрната №1 ГДТУ імя П.О.Сухога з выхавацелем Галінай Мікалаеўнай Асенькінай.

Пачатак вечара абяцаў шмат цікавых конкурсаў і нумароў, а студэнцкае кафэ інтэрната, на вялікі жаль, так і не змагло ўмясціць усіх жадаючых. Вядучыя вечара — пяцікурсніцы філфака Таццяна Пятрунька і Кацярына Янкова — падрыхтавалі і правялі шмат цікавых, прыхільна сустрэтых гледачамі нумароў. Цяжка было ўтрымацца ад смеху, назіраючы за ўдзельнікамі конкурсаў "Мумія", "Вадзіцелі" і інш. А як прыемна ўспомніць дзяцінства, пабываўшы ў старой добрай казцы, дзе нашы студэнты даволі няблага ўдзельнічалі побач з гасцямі. На "ура" быў сустрэты традыцыйны конкурс прыпевак, а вялікія літаратуразнаўчыя здольнасці праявілі ўдзельнікі ў паэтычным конкурсе.

Час ад часу "разбаўлялі" вечар цудоўныя песенныя кампазіцыі на беларускай і рускай мовах студэнтак-першакурсніц філфака Аксаны Волкавай і Анастасіі Бараш. Падсалоджваў вечар добра арганізаваны салодкі стол, за што вялікі дзякуй трэба сказаць нашаму нястомнаму выхавацелю-культарганізатару Валянціне Міхайлаўне Варонінай і галоўнаму, нязменнаму спонсару ўсіх мерапрыемстваў — прафкому студэнтаў ГДУ на чале з Н.І.Колтышавай.

"Вашы дзяўчаты і хлопцы мяне вельмі ўразілі,— сказала Г.М.Асенькіна. — Цудоўныя галасы, вялікі талент і пачуццё гумару — такому варта пазайздросціць!"

Напрыканцы свята студэнты абмяняліся памятнымі падарункамі — буклетамі сваіх ВНУ, дамовіліся сустрэцца ў снежні ў сценах інтэрната №1 ГДТУ імя П.О.Сухога.

І, канешне, завяршыла вечар любімая ўсімі святочная дыскатэка.

**Сяргей АРЦЁМАЎ,**
**студэнт гр.БА-33**
**філалагічнага факультэта,**
**жыхар інтэрната №1.**

**В бюрократических лабиринтах**

# БЕЗ БУМАЖКИ – ДОМ БУКАШКА...

С того времени, как в новом Гражданском кодексе Республики Беларусь появилось понятие государственной регистрации недвижимого имущества (а право собственности на эту недвижимость возникает с момента ее регистрации), к нам, юристам, обращаются граждане практически по одному и тому же вопросу. Люди, тридцать и более лет назад построившие своими мозолями и за свои средства дома, теперь узнают, что ... не являются собственниками. Обратись в бюро технической инвентаризации, уплати энную сумму денег, зарегистрируй свой дом, получи на него новехонький техпаспорт — вот тогда ты и есть самый настоящий собственник. И не так-то просто это сделать. Нужна куча документов: нотариально заверенный договор на застройку, разрешение исполкома на регистрацию хозяйственных построек, надо вызвать техника из БТИ для обмера и получения копии его плана. Впрочем, можно спокойно жить и дальше и не думать о паспорте для своего уже зачастую состарившегося жилища. Но без этого документа, в случае смерти собственника, его детям и прочим наследникам долго и мучительно придется доказывать свое право на наследство.

А может случиться ситуация, рассказанная мне случайным попутчиком из Гомельской области в поезде Гомель-Минск. К больному отцу и парализованной уже четыре года матери вернулась на жительство дочь с двумя малолетними детьми и без средств к существованию. Выписалась на прежнем месте и обратилась за пропиской в местный сельсовет. Прописаться надо было срочно, в течение 30 дней, как и требуют законы приграничной зоны. Но не тут-то было. Коль техпаспорта на дом нет, его площадь неизвестна, значит, и прописать дочь без этого нельзя. На оформление техпаспорта, кроме денег, нужно больше месяца времени. Как тогда зарегистрироваться в течение 30 дней?

В отчаянии человек обращается в юридическую консультацию, пишет письма в редакции газет, надеясь, что здесь поправят того, кто поступил по отношению к нему несправедливо, превысил свои полномочия. В конце концов, чтобы застраховать дом по обязательному страхованию, никто ни обмера, ни техпаспорта не потребовал, уплати 7000 рублей и будь здоров. Увы, уважаемые сограждане, никакого злоупотребления должностными обязанностями по отношению к вам не допущено. С вас потребовали то, что требует Гражданский кодекс. И эти его строгие постулаты надо иметь в виду всем владельцам частных домов и квартир, именуемых в этом документе недвижимым имуществом.

Без бумажки они, как и человек, букашки.

Конечно, нельзя сказать, что регистрация недвижимости — процедура ненужная. В конце концов у каждого собственника на руках должен быть полновесный документ на эту собственность. К рынку ведь идем. Но учитывая то, что мы много лет жили при социализме и этого не требовалось, неужели нельзя было с момента "икс" выдать техпаспорта всем, пусть и за небольшую плату, но без нервотрепки, лишнего хождения по инстанциям за справками? Зная то, что науку всеобщей паспортизации недвижимости, а это касается дач и гаражей ГСК, вынуждены осваивать зачастую уже немолодые люди.

**С.ЖАГОРОВ,**
**ст. преподаватель кафедры теории и истории государства и права.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
—вышэйшай матэматыкі — дацэнта;
—тэорыі і методыкі фізічнай культуры — старшага выкладчыка;
—спартыўных дысцыплін —заг.кафедры.
Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.
Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая,104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 633
Падпісана да друку 17.11.2000